УДК 94(476):331.108

# ЭКАНАМІЧНЫЯ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР І МЕРЫ ПА ІХ ПЕРААДОЛЕННЮ (1971–1990)

**Пушкін Ігар Аляксандравіч**
дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання»,
дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

*Раскрыты і прааналізаваны наступныя эканамічныя і сацыяльныя праблемы: тэхнічная рэканструкцыя прадпрыемстваў, якасць тавараў і рытмічнае забеспячэнне насельніцтва харчовымі і спажывецкімі таварамі, стан экалогіі, парушэнні працоўнай дысцыпліны, злоўжыванне алкагольнымі напоямі, цякучасць кадраў і іншыя. Зроблена выснова, што ў 1971–1990 гг. адміністратыўна-рэпрэсіўныя меры і спробы эканамічнага стымулявання па вырашэнню праблем у прамысловасці БССР мелі кароткачасовы эфект.*

Эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў прамысловасці БССР нічым не адрозніваліся ад агульнасаюзных. Цэнтральную і рэгіянальную партыйна-дзяржаўную ўладу хвалявалі пра-



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

блемы ў прамысловасці, якія залежылі і адначасова ўплывалі на кадравы патэнцыял прадпрыемстваў і краіны: маруднае і не паслядоўнае развіццё НТП, нізкая якасць тавараў, злоўжыванні ўладнымі паўнамоцтвамі, злачыннасць і крадзяжы дзяржаўнай маёмасці на вытворчасці, ужыванне алкаголю на працоўных месцах, парушэнні працоўнай дысцыпліны, цякучасць, узровень кваліфікацыі і падрыхтоўка кадраў, недахоп жылля, несвоечасовыя пастаўкі будаўнічых матэрыялаў і запчастак, невыкананне паставак ад сумежнікаў, недастатковае і несвоечасовае фінансаванне, нерытмічнасць у працоўным працэсе, прастоі з-за не выканання сваіх абавязацельстваў іншымі прадпрыемствамі і іншыя [9, арк. 5–6, 113–118, 183–195].

Праблемы тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасці вырашаліся марудна і непаслядоўна, мелася шмат тэхнічна адсталых прадпрыемстваў. У 1977 г. удзельная вага работнікаў прамысловасці БССР, занятых ручной працай, дасягала 37,8% ад усяго вытворчага персаналу. На працягу 1976–1980 гг. на шэрагу прадпрыемстваў Брэста, Бабруйска, Барысава, Віцебска, Гомеля, Маладзечна, Оршы ручная праца складала ад 31,5 да 49%. У 1985 г. у прамысловасці ручной працай быў заняты амаль кожны трэці рабочы [7, с. 386–387; 12, арк. 17–19; 10, арк. 65; 1, с. 395–396; 2, с. 402].

Шмат невыкарыстаных магчымасцей мелася ў тэхнічнай творчасці рабочых і спецыялістаў, дзейнасці вынаходнікаў і рацыяналізатараў. За 1971–1975 гг. толькі ў Гомельскай вобласці ад укаранення ў вытворчасць 87000 рацыяналізатарскіх прапаноў і больш за 1000 вынаходстваў атрымалі эканамічны эфект каля 92 млн руб. За 1976–1980 гг. у прамысловасці БССР было пададзена 542,8 тыс. рацпрапаноў і заявак на вынаходніцтвы, эканамічны эфект ад іх выкарыстання склаў 594,9 млн руб. Аднак кожная шостая рацыяналізатарская прапанова не знаходзіла прымянення. Больш паловы вынаходніцтваў праходзілі ўкараненне ў тэрмін ад 3 да 10 гадоў [16, арк. 161; 7, с. 388; 1, с. 546].

Партыйна-савецкае кіраўніцтва СССР і БССР не здолела вырашыць праблемы якасці тавараў і рытмічнага забеспячэння насельніцтва харчовымі і спажывецкімі таварамі. Напрыклад, у Віцебскай вобласці па ўпраўленню мясцовай прамысловасці ў ІІІ квартале 1972 г. 45,45% прадпрыестваў выпускалі прадукцыю з парушэннем патрабаванняў стандартаў і тэхнічных умоў [15, арк. 16]. За 9 месяцаў 1973 г. лабараторыяй Дзяржстандарта на пяці прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Гомельскай вобласці было забракавана 100% праверанай прадукцыі [14, арк. 20–21]. Працэсы ўрбанізацыі, манапалізм і адміністатыўна-камандная сістэма спарадзілі дэфіцыт і такое паняцце як «блат». На сесіі Аршанскага гарадскога савета (1975) прагучала, што пакупнік не мог свабодна купіць у крамах мукі вышэйшага гатунку, рысу, мяса, каўбас і шэраг іншых тавараў [11, арк. 13–14]. У Магілёўскім гархарчгандлі (1988) у 75% праверанных крам адсутнічалі тавары, прадугледжаныя асартыментным пералікам [5, арк. 29].

Небяспечная экалагічная абстаноўка склалася ў буйных прамысловых цэнтрах Віцебскай і Магілёўскай абласцей: Бабруйску, Віцебску, Крычаве, Магілёве, Наваполацку [4, арк. 37; 19, арк. 62; 21, арк. 55–56]. Шкодныя выкіды г. Наваполацка (1990) складалі 37,3% ад агульнай колькасці шкодных рэчываў па Віцебскай вобласці [8, арк. 81].

З пачатку 1970-х гг. у індустрыяльным комплексе БССР пачала абвастрацца праблема парушэнняў працоўнай дысцыпліны. На прамысловых прадпрыемствах г. Орша ў 1970 г. прагулы здзейснілі 1619 чал. (6304 чалавека-дзён), Наваполацка – 1180 чалавека-дзён [18, арк. 20–21; 6, арк. 84, 86]. За 1976–1980 гг. у прамысловасці страты працоўнага часу склалі амаль 5 млн чалавека-дзён. У 1983 г. за прагулы, іншыя парушэнні ў БССР было звольнена 6 тыс. маладых рабочых [1, с. 392].

Стабільна высокім заставаўся ўзровень злачыннасці і фактаў злоўжыванняў уладаю на прамысловых прадпрыемствах і ва ўстановах. Крадзяжы дзяржаўнай маёмасці і злоўжыванні ўладай закранулі практычна ўсе сферы дзейнасці ў БССР [гл. падрабязна: 17, с. 32–42].

У грамадстве абвастрылася праблема злоўжывання алкагольнымі напоямі. Дзелавыя сустрэчы, злёты перадавікоў, узаемаправерка ходу спаборніцтва суправаджаліся калектыўнымі выпіўкамі, у якіх актыўна ўдзельнічалі і кіруючыя кадры [13, арк. 201]. У 1988 г. на 3 тыс. прадпрыемствах БССР у нецвярозым стане выявілі амаль 17 тыс. чал., на вытворчасці загінулі 443 работнікі, з іх кожны чацвёрты знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення [1, с. 548].

Стабільнай была праблема цякучасці кадраў, якая істотна парушала рытмічнасць вытворчасці, параджала штурмаўшчыну, звышурочныя работы, адмоўна ўплывала на якасць прадукцыі. Напрыклад, цякучасць рабочай сілы прамыслова-вытворчых рабочых г. Орша ў 1970 г. склала 15,9% (1974 – 15,6%, 1984 – 11,7%), на прадпрыемствах г. Наваполацка (1970) цякучасць кадраў за год склала 12,2% [20, арк. 23; 22, арк. 170–171, 172, 178; 3, арк. 84]. У 1980-х гг. цякучасць кадраў стала памяншацца.

Партыйна-савецкае кіраўніцтва шляхам прапаганды і прыняцця адміністратыўных мер у кадравай і іншых сферах развіцця прамысловасці спрабавала вырашыць эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў грамадстве. Але адміністратыўна-рэпрэсіўныя меры і спробы эканамічнага стымулявання мелі кароткачасовы эфект з-за існаваўшых абмежаванняў, сістэмы размеркавання, дэфіцыту сацыяльных даброт, прадметаў шырокага спажывання. Прапаганда камуністычных ідэалаў і ідэалагічныя ўстаноўкі не заўжды спрацоўвалі, аб чым сведчаць выказванні працоўных падчас сустрэч на вытворчасці. Становішча ў прамысловасці дазваляла яскрава пабачыць разыходжанні паміж дэкларуемымі прынцыпамі і рэчаіснасцю. Нягледзячы на прымаемыя меры (або іх імітацыю), негатыўныя праявы ў прамысловасці не знікалі. Кіраўніцтву краіны не ўдалося ажыццявіць інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск : Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.

2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Кн. 2 / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі ; Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 654 с.

3. Движение численности промышленно-производственных рабочих на предприятиях г. Новополоцка. 1970 г. // Занальны дзяржаўны архіў г. Полацка (ЗДАПол). – Ф. 1220. Воп. 1. Спр. 62.

4. Информационная записка Могилевского облисполкома об организационно-массовой работе местных советов за 1973 г. // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМаг). – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2223.

5. Информация от 04.08.1988 г. о ходе выполнения постановления бюро Могилёвского ОК КПБ // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). – Ф. 9. Воп. 187. Спр. 213.

6. Использование времени промышленных рабочих на предприятиях Новополоцка (1970) // ЗДАПол. – Ф. 1220. Воп. 1. Спр. 62.

7. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2-х ч. – Ч. 2. / М. П. Касцюк , І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі [і інш.] ; Інстытут гісторыі АНБ. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

8. Об охране природных ресурсов и окружающей среды по г. Новополоцку. 20.12.1990 г. // ЗДАПол. – Ф. 1220. Воп. 2. Спр. 497.

9. Перечень характерных вопросов, поступивших от трудящихся Могилёвской области в ходе выступлений лекторов; критических замечаний, высказанных на отчётных собраниях и конференциях Могилёвской области в 1980 г. // ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 165. Спр. 72.

10. Протокол № 10 заседания бюро Витебского областного комитета КПБ от 28.04.1984 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 1-п. Воп. 161. Спр. 28.

11. Протокол № 11 одиннадцатой сессии Оршанского городского Совета депутатов от 23.01.1975 г. // Занальны дзяржаўны архіў г. Орша (ЗДАОрш). – Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406.

12. Протокол № 20 Гомельской областной партийной конференции (1979) // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (ДАГАГом). – Ф. 144. Воп. 153. Спр. 78.

13. Протокол № 8 заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3.

14. Протокол заседания бюро Гомельского ОК КПБ // ДАГАГом. – Ф. 144. Воп. 140. Спр. 14.

15. Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // ДАВц. – Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8.

16. Протокол XIX Гомельской областной партийной конференции (1975) // ДАГАГом. – Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1.

17. Пушкін, І. А. Злоўжыванні ўладаю і пралікі ў кадравай палітыцы БССР у 1970–1980-я гг. (на прыкладзе Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей) / І. А. Пушкін // Карупцыйныя рызыкі кадравага патэнцыяла Беларусі: зборнік навуковых артыкулаў / уклад. Ю. М. Бубнаў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2019. – С. 32–42.


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

18. Резервы и возможности для успешного выполнения плана на 1971–1975 гг. промышленностью г. Орша // ЗДАОрш. – Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23.

19. Решение № 392-17с Витебского облисполкома от 20.08.1980 г. // ДАВц. – Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 199.

20. Справка о движении численности промышленно-производственных рабочих города Орша за 1970 год // ЗДАОрш. – Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23.

21. Справка о состоянии воздушного бассейна в районе улицы Челюскинцев г. Могилёва и мерах по его оздоровлению от 29.04.1984 г. // ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 175. Спр. 72.

22. Справка об итогах выполнения плана экономического и социального развития города Орши за 1984 год // ЗДАОрш. – Ф. 27. Воп. 4. Спр. 985.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова